Матусевіч М.Ю., студ. гр. 402 ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Грачова В.А.,
дацэнт

# КАНТРОЛЬ ЗА ЯКАСЦЮ АДУКАЦЫІ Ў КРАІНАХ-УДЗЕЛЬНІЦАХ БАЛОНСКАГА ПРАЦЭСУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Балонскі працэс – гэта працэс збліжэння і гарманізацыі сістэм адукацыі краін Еўропы з мэтай стварэння адзінай еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ЕПВА). Гэты працэс распачаўся 19 чэрвеня 1999г. пасля падпісання дэкларацыі «Зона еўрапейскай вышэйшай адукацыі», альбо Балонскай дэкларацыі.

Як нам удалося высветліць, на дадзены момант малая колькасць студэнтаў, выкладчыкаў, а таксама іншых зацікаўленых бакоў ведаюць пра Балонскі працэс у цэлым і пра кантроль за якасцю аукацыі ў ім у прыватнасці. На нашу думку гэта з'яўляецца **праблемай**, бо актыўнае ўключэнне Беларусі ў Балонскі працэс ёсць справа бліжэйшага часу. Пацверджаннем гэтага можа служыць студзеньская заява міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, што міністэрства прадставіла «афіцыйны дакумент па ўваходжанні ў Балонскі працэс у Адміністрацыю прэзідэнта. Беларусь будзе актыўна прасоўвацца ў гэтым напрамку»[1]. Акрамя таго, ў красавіку 2009г. міністр заявіў: «У цяперашні час мы працуем над тым, каб увайсці ў Балонскі працэс. Мы лічым, што гэта не закране структуру зместа і ідэалогію айчыннай адукацыі. Гэта агульнаеўрапейская сістэма, і яна заўсёды цанілася»[2].

**Мэта** работы – *знаёмства з ўмовамі, механізмамі і ўзроўнямі забеспячэння якасці адукацыі ў Балонскім працэсе*.

На дадзены момант у Балонскім працэсе ўдзельнічаюць 46 краін. Беларусь адзіная еўрапейская дзяржава, якая афіцыйна знаходіцца па-за гэтым працэсам.

У сферы кантролю за якасцю адукацыі асноўнай задачай Балонскага працэсу з'яўляецца «садзейнічанне еўрапейскай кааперацыі ў галіне

забеспячэння якасці адукацыі для распрацоўкі супараўнальных крытэрыяў і метадалогій» [3, с. 4]. Ацэнка якасці ажыццяўляецца на розных узроўнях: еўрапейскім, нацыянальным і на ўзроўні універсітэта. Існуюць знешнія і ўнутраныя механізмы забеспячэння якасці.

**Умовы забеспячэння якасці адукацыі**. Факт падпісання Балонскай дэкларацыі запусціў дыскусію па пытанні якасці адукацыі. Так, на сустрэчы ў Саламанцы (29-30 сакавіка 2001г.), дзе прысутнічалі прадстаўнікі больш як 300 еўрапейскіх універсітэтаў, праблема забеспячэння якасці адукацыі і яе ацэнкі стала цэнтральнай. Якасць вызначаецца як «краевугольны камень», «асноўная ўмова забеспячэння даверу, рэлевантнасці, мабільнасці, сумяшчальнасці і прывабнасці Зоны еўрапейскай вышэйшай адукацыі»[4, с. 2]. Асноўны тэзіс сустрэчы: **якасць адукацыі павінна быць гарантавана**.

Пад гарантаванасцю якасці адукацыі маецца на ўвазе *выпрацоўка сумяшчальных сістэм кантролю*, арыентаваных на парогавыя стандарты вышэйшай адукацыі, якія ўсталёўваюць *патрабаванні да ўзроўня падрыхтоўкі выпускнікоў* (вынікі), але не часавыя і змястоўныя параметры працэсу. Іншымі словамі, у парогавых стандартах адбываецца ссоўванне акцэнтаў з колькасна-выдатковых паказчыкаў на паказчыкі выніку: *кампетэнтнасць*, *навучанасць*, *веды* выпускніка і інш. Працэс авалодання ведамі набывае больш самастойны характар з перыядычнай здачай прамежкавых іспытаў: тэстаў, эсэ і г.д. Крытэрыямі якасці выступаюць падрыхтаванасць да практычнай дзейнасці і рэальная канкурэнтаздольнасць выпускнікоў. Важным з'яўляецца вынік навучальнага працэсу, а не працэс яго дасягнення. Другая ўмова забеспячэння якасці адукацыі – гэта стварэнне сістэм незалежнага ацэньвання, і трэцяя – каардынаванне падыходаў да стандартаў якасці транснацыянальнай адукацыі.

Прынятыя пасля падпісання Балонскай дэкларацыі сумесныя дакументы міністраў адукацыі ставяць за мэту **распрацаваць дзейсныя сістэмы забеспячэння якасці**. Пры гэтым вызначаны ўзроўні, на якіх яны ствараюцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




**Механізмы забеспячэння якасці** можна падзяліць на знешнія і ўнутраныя.

**ЗНЕШНІЯ**

- праходжэнне працэдур акрэдытацыі і атэстацыі (у т.л. у міжнародных арганізацыях);
- уцягванне працадаўцаў і бацькоў у працэс ацэнкі якасці.

**УНУТРАНЫЯ**

- выкарыстанне метадаў самаацэнкі;
- уцягванне студэнтаў у працэс ацэнкі якасці;
- стварэнне аддзелаў унутранай якасці.

Важнае месца у працэсе забеспячэння якасці адукацыі надаецца **ўдзелу студэнтаў**. Самая распаўсюджаная форма якога – *запаўненне апытальнікаў* з мэтай правядзення ўнутранага ацэньвання ў рамках працэдур унутранага забеспячэння якасці ВНУ. На другім узроўні экспертамі праводзяцца кансультацыі са студэнтамі падчас правядзенні знешніх праверак ВНУ. На трэцім – студэнты могуць браць удзел у знешніх праверках ВНУ ці навучальных праграм. На чацвёртым – студэнты маюць магчымасць удзельнічаць у кіраванні дзяржаўнымі агенцтвамі па забеспячэнні якасці. Справаздачы краін-удзельніц Балонскага працэсу сведчаць, што студэнты большасці краін (больш чым 2/3) уцягнуты ў першыя тры ўзроўні. Гэта і зразумела, бо чацвёрты ўзровень патрабуе высокай прафесійнай падрыхтоўкі.

На еўрапейскім кантыненцце пытанне якасці вышэйшай адукацыі актыўна абмяркоўваецца каля 25 гадоў. За гэты час дасягнуты пэўныя вынікі: распрацаваны і імплементуюцца палажэнні дакумента «Стандарты і рэкамендацыі для гарантыі якасці вышэйшай адукацыі ў еўрапейскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасторы», заснавана Еўрапейская сетка па забеспячэнні якасці ў вышэйшай адукацыі (ENQA), праводзяцца перыядычныя апытанні студэнтаў на тэму якасці адукацыі, працуе сістэма незалежнай знешняй ацэнкі якасці адукацыі і механізмы ўнутранага кантролю.

У Беларусі таксама запушчаны працэс па фармаванні сістэмы кантролю за якасцю адукацыі. Па словах першага намесніка міністра адукацыі Аляксандра Жука «падвышэнне якасці вышэйшай адукацыі – адзін з найбольш важных прыярытэтаў у адукацыйнай палітыцы нашай дзяржавы. Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця прадугледжана вывядзенне сістэмы адукацыі Беларусі на ўзровень, які адпавядае сусветным стандартам»[5]. На дадзены момант праводзіцца праца па ўкараненні ў ВНУ менеджмента якасці адукацыі на аснове міжнароднага стандарта ICO 9001.

У гэты працэс уключаны і універсітэт культуры і мастацтваў, у якім працуе аддзел менеджмента якасці адукацыі, а таксама запушчаны працэс стварэння студэнцкага савета па якасці адукацыі, які можа стаць чацвёртым па ліку ў Беларусі.

17 сакавіка 2010г. ва універсітэце праводзілася дыскусія на тэму таго, якім чынам студэнты могуць ўплываць на якасць адукацыі. У рамках дадзенай дыскусіі я выступіў з дакладам «Еўрапейскі вопыт уплыву студэнтаў на якасць адукацыі», у якім спрабаваў раскрыць сутнасць кантролю за якасцю адукацыі ў краінах-удзельніцах Балонскага працэсу, а таксама адлюстраваць месца і уплыў студэнтаў на гэты працэс. Узнятая тэма выклікала жывую дыскусію. Прысутныя сыйшліся на тым, што студэнты, як і выкладчыкі, і прадстаўнікі адміністрацыі, павінны быць актыўнымі актарамі ў працэсе забеспячэння якасці адукацыі, а стварэнне студсавета па якасці адукацыі ў нашым універсітэце своечасова.

Усё раней сказанае сведчыць пра тое, што пытанне забеспячэння якасці адукацыі ў Балонскім працэсе займае адну з найбольш важных пазіцый. Распрацаваны шэраг дакументы, якія спрыяюць забеспячэнню якасці адукацыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у т.л. «Стандарты і рэкамендацыі для гарантыі якасці вышэйшай адукацыі ў еўрапейскай прасторы». Таксама выпрацаваны асноўныя механізмы і акрэслены ўзроўні забеспячэнне якасці адукацыі.

Літаратура:

1. http://www.naviny.by/rubrics/society/2010/02/02/ic_articles_116_166462/ – Минобразования разморозило процесс присоединения к Болонскому процессу.

2. http://vuz2009.belta.by/ru/main_news?id=272736 – Беларусь планирует присоединиться к Болонскому процессу – Радьков.

3. http://www.ond.vlaanderen.be/hogeronderwijs/bologna/documents/MDC/BOLOGNA_DECLARATION1.pdf – Балонская дэкларацыя.

4. http://www.bologna.msmt.cz/PragueSummit/Salamanca-message.pdf – Паведамленне з Канвенцыі еўрапейскіх вышэйшых навучальных установ, прынятай у Саламанцы.

http://www.respublika.info/4635/edu/article27329/ – Равнение на международные стандарты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ